кіраўніцтва практыкай. Вялікая частка іх выконвае свае абавязкі на высокім метадычным узроўні: выкладчыкі кафедраў менеджменту, сацыяльнай педагогікі, народна-інструментальнай творчасці, бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і дакументазнаўства, беларускай і сусветнай мастацкай культуры і інш. Яны добрасумленна аказваюць дапамогу студэнтам у авалодванні прафесійнымі навыкамі.

Малады спецыяліст сёння — гэта чалавек творчага пошуку. Найбольшага поспеху дасягае той, хто не проста ведае тэхналогію, прадумана арганізуе працу, але яшчэ і можа з усёй разнастайнасці дасягненняў навукі, перадавога вопыту выбіраць самае каштоўнае, тое, што больш за ўсё адпавядае ўмовам канкрэтнага працоўнага калектыву. Наша задача — дапамагаць будучым спецыялістам здабываць патрэбныя ім веды і навыкі падчас вытворчай практыкі.

**Караткевіч А.А.**, выкладчык

## АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

На факультэце мастацкай творчасці выкарыстоўваюцца наступныя базы правядзення вытворчай практыкі: прафесійныя калектывы, мастацкія калектывы буйных клубных устаноў, вучылішчы мастацтваў, ліцэі, музычныя школы, сярэднія школы з музычна-эстэтычным ухілам, студэнцкія, падлеткавыя клубы, студыі бальных танцаў і інш. У апошні час практыка адбывалася ў 72 творчых калектывах.

Асаблівую ўвагу пры размеркаванні студэнтаў на практыку ўдзяляюць дзіцячым мастацкім калектывам. Сёння існуе патрэба ў дыпламаваных спецыялістах, здольных кіраваць дзіцячай самадзейнасцю, весці ў школах, пазашкольных установах эстэтычную выхаваўчую работу. Праходжанне перадцыпломнай вытворчай практыкі ў дзіцячых мастацкіх калектывах своечасова рыхтуе студэнтаў да самастойнай работы пасля заканчэння ВНУ. Праца ў дзіцячых калектывах узбройвае практыкантаў трывалымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навыкамі ў прафесійнай сферы, у сферы ўзаемаадносін з дзецьмі, дазваляе выкарыстоўваць набытыя веды па педагогіцы, псіхалогіі, методыцы работы з дзіцячымі калектывамі.

Вынікі практыкі паказваюць: работа з дзецьмі для студэнтаў актуальная, перспектыўная.

На высокім узроўні арганізавана практыка навучэнцаў у прафесійных мастацкіх калектывах. У час яе студэнты вывучаюць рэпертуар калектываў. Яны ўдзельнічаюць у рэпетыцыйным працэсе, канцэртнай дзейнасці, авалодваюць навыкамі выканання. Станоўчыя водгукі, атрыманыя пасля праходжання практыкі студэнтамі, дазваляюць прыйсці да высновы аб якаснай іх падрыхтоўцы да пераддыпломнай вытворчай практыкі.

Факультэту мастацкай творчасці, безумоўна, ёсць чым ганарыцца. У знакамітых прафесійных калектывах Беларусі (Дзяржаўным народным хоры пад кіраўніцтвам М.П.Дрынеўскага, Дзяржаўным аркестры народных інструментаў імя І.Жыновіча, Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі, Дзяржаўным ансамблі танца, Дзяржаўным канцэртным аркестры Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам М.Я.Фінберга, аркестры духавых інструментаў "Няміга", эстрадным аркестры Дзяржаўнага цырка Рэспублікі Беларусь, ансамблі песні і пляскі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, харэаграфічным ансамблі "Харошкі", ансамблі "Свята" і інш.) працуюць нашы выпускнікі.

Вопыт сведчыць: менавіта работа ў прафесійных калектывах садзейнічае станаўленню асобы студэнта. Таму ёсць сэнс шырэй выкарыстоўваць іх у якасці базавых установ на ўсіх спецыялізацыях факультэта.

Падчас практыкі выкарыстоўваюцца мастацкія калектывы, што працуюць у Палацах, Дамах культуры, студэнцкіх клубах. Многія з іх маюць ганаровае званне "народны", узначалены вопытнымі высокапрафесійнымі кіраўнікамі, вядуць актыўную канцэртную дзейнасць, выязджаюць за мяжу, маюць разнастайны рэпертуар. Практыка ў калектывах з набыццём прафесійных навыкаў дапамагае засвойваць уменні арганізацыйнай працы, навыкі фінансавай дзейнасці, менеджменту і інш. Гэта робіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць творчага калектыву трывалай, набліжанай да ідэальнай.

Праходжанне практыкі ў такіх калектывах карыснае для працаўладкавання студэнтаў, паколькі большая частка выпускнікоў накіроўваецца ў клубныя ўстановы.

Вялікую ўвагу кафедры надаюць арганізацыі вытворчай практыкі ў калектывах фальклорнага накірунку. Адраджэнне фальклору — гэта адна з актуальных праблем. Важна таму рыхтаваць прафесійныя кадры для кіраўніцтва фальклорнымі калектывамі. Практыка ў гэтых калектывах дазваляе студэнтам знаёміцца са спецыфікай засваення фальклору, набываць патрэбныя ўменні ў падборы, фарміраванні рэпертуару, у пастаноўцы спеўнага голасу адпаведна народна-інструментальнаму выкананню.

Увогуле практыка паказвае: якраз выбар базавых калектываў, багацце, шматстайнасць іх накірункаў, творчых стыляў даюць магчымасць студэнтам абраць найбольш прывабнае для сябе, глыбока засвойваць неабходныя ўменні для будучага паспяховага кіраўніцтва творчым калектывам; вучаць іх самастойнай рабоце.

У якасці прапаноў па паляпшэнні практыкі можна выказаць наступнае:

— трэба праналізаваць магчымасці кожнай базавай установы, адмовіцца ад тых з іх, што па сваім узроўні, іншых параметрах не адпавядаюць патрабаванням вышэйшай школы; мэтазгодна пашыраць колькасць баз за кошт выкарыстання навучальных устаноў творчага накірунку, дзіцячых школьных, пазашкольных устаноў;
— неабходна праводзіць выязную пераддыпломную практыку. Яна дасць падставы для працаўладкавання многіх выпускнікоў Беларускага універсітэта культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ